**УДК 821.161.3.09-312.2«19/20»**

# МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ АСОБЫ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ ХХ–ХХІ СТАГОДДЗЯЎ

***Н.М. НАЛЁТАВА***
***(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. П.М. Машэрава)***
***nalyotova.nathalie@mail.ru***

*Даследаванне мастацкай інтэрпрэтацыі гістарычных падзей і асоб, звязаных з беларускай рэчаіснасцю, не страчвае сваёй актуальнасці ў цяперашні час і прыцягвае ўвагу сучасных літаратуразнаўцаў. Пры адлюстраванні падзей мінулага аўтары, несумненна, абапіраюцца на дадзеныя гістарычнай навукі. Аднак немалаважную ролю ў такіх выпадках адыгрывае і мастацкая фальсіфікацыя. Сучасныя беларускія пісьменнікі канцэптуальна-гістарычна інтэрпрэтуюць асобу Еўфрасінні Полацкай, але пры гэтым імкнуцца не аддаляцца ад прататыпа, прадстаўленага ў «Жыціі Еўфрасінні Полацкай». Праводзіцца даследаванне мастацкага вобраза Еўфрасінні Полацкай у беларускай гістарычнай прозе ХХ–ХХІ стст. Сцвярджаецца, што ў прааналізаваных творах пісьменніцы Вольга Іпатава і Валянціна Коўтун па-свойму інтэрпрэтуюць гэты вобраз, падаюць больш ці менш праўдападобным у параўнанні з гістарычным прататыпам.*

***Ключавыя словы:*** *беларуская проза, мастацкая інтэрпрэтацыя, культура, дзеяч культуры, Еўфрасіння Полацкая.*

**Уводзіны.** Гістарычныя падзеі заўсёды з'яўляюцца адным з самых запатрабаваных аб'ектаў у мастацтве. Як заўважае даследчыца Вольга Карпаўна Шынкарэнка, цікавасць да мінулага «найбольш узрастае ў пераломныя моманты нацыянальна-вызваленчых рухаў, сацыяльных рэвалюцый, выспявання і падрыхтоўкі карэнных змен, пераасэнсавання гісторыі і абуджэння свядомасці» [1, с. 95].

Даследаванне мастацкага адлюстравання вобразаў выдатных культурных дзеячаў у беларускай прозе ХХ–ХХІ стст. з'яўляецца, на нашу думку, актуальным і запатрабаваным, бо яно пашырае і паглыбляе ўяўленні пра ролю і месца айчыннага мінулага ў свядомасці нашага грамадства, пра шляхі нацыянальнага самапазнання беларусаў, асаблівасці іх менталітэту і іншае. Таксама трэба ўлічваць і той факт, што мастацкая літаратура ў пэўнай ступені здольна паўплываць на духоўнае і маральнае развіццё грамадства, выступаючы ў якасці эфектыўнага сродку фарміравання патрыятычных пачуццяў.

Такім чынам, даследаванне літаратурных твораў, якія асвятляюць падзеі мінулых часоў, з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў сучаснага беларускага літаратуразнаўства.

Думаецца, што ва ўмовах нацыянальнага «самазабыцця», нігілізму беларусаў мастацтва слова павінна служыць галоўнай мэце – папулярызацыі айчыннай гісторыі і сцвярджэнню самабытнасці нашага народа.

Адным з першых беларускіх пісьменнікаў у гэтым накірунку актыўна пачаў працаваць Уладзімір Караткевіч, які ў сваіх гістарычных раманах і аповесцях «Каласы пад сярпом тваім», «Нельга забыць», «Сівая легенда», «Цыганскі кароль» і інш. мэтанакіравана рамантызаваў і ўзвышаў падзеі даўніны. У вобразах рэальных гістарычных асоб ён намагаўся знайсці і сцвердзіць этапы маральна-духоўнага развіцця беларускага народа.

У сувязі з грамадска-палітычнымі катаклізмамі ХХ–ХХІ стст. многія нашы сучаснікі, як слушна заўважае даследчык літаратуры І.М. Запрудскі, «страцілі адчуванне мінулага» [2, с. 6]. Справа ў тым, што ў такіх умовах беларускія пісьменнікі пачалі адчуваць асабістую адказнасць у яго «вяртанні» і адраджэнні, чым і тлумачыцца іх актыўны зварот да гістарычнай тэматыкі. Так, караткевічаўскія традыцыі працягнулі Вольга Іпатава, Леанід Дайнека, Вітаўт Чаропка, Людміла Рублеўская, Кастусь Тарасаў, Уладзімір Арлоў і інш.

Як вядома, адной з неабходных умоў гістарычнага твора з'яўляецца прысутнасць і дзеянне ў ім рэальных, сапраўдных асоб. Дадзены артыкул прысвечаны даследаванню мастацкага вобраза Еўфрасінні Полацкай у беларускай гістарычнай прозе ХХ–ХХІ стст. Аб'ектам даследавання з'яўляецца аповесць «Прадыслава» Вольгі Іпатавай і раман-жыцце «Пакліканыя» Валянціны Коўтун.

**Асноўная частка.** У названых намі вышэй гістарычных творах Вольга Іпатава і Валянціна Коўтун паспрабавалі пераасэнсаваць зробленае славутай асветніцай і гуманісткай ХІІ ст., адлюстраваць яе перадавыя для свайго часу погляды на адукацыю і грамадства, а таксама падкрэсліць яе значэнне для развіцця нацыянальнай культуры.

Зазначым, што Еўфрасіння Полацкая не толькі дала магутны імпульс развіццю асветніцтва і педагогікі на беларускіх землях, але і заклала фундаментальныя падмуркі стварэння інстытутаў абароны

правоў чалавека, палітычнай дыпламатыі – усяго таго, што застаецца канцэптуальна перспектыўным, а значыць, запатрабаваным сучасным грамадствам. Гэта імя сёння сімвалізуе росквіт культуры і маральнага абнаўлення на ўсходнеславянскай тэрыторыі ў эпоху Сярэднявечча. Думаецца, што асэнсаванне дзейнасці такіх выхадцаў з беларускіх зямель, як Францыск Скарына, Сімяон Полацкі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, немагчыма без уліку асобы Еўфрасінні Полацкай – іх землячкі, папярэдніцы і, бясспрэчна, духоўнай натхняльніцы.

Адразу заўважым, што да мастацкага вобраза сярэднявечнай асветніцы Еўфрасінні Полацкай сучасная беларуская пісьменніца Вольга Іпатава звярнулася спачатку ў вершы «Князёўнаю Полацкаю пачаты …», а пазней у аповесці «Прадыслава» (1971). Па сутнасці, названая намі аповесць з'яўляецца рамантычным жыццяпісам полацкай князёўны. Асноўнай крыніцай для напісання «Прадыславы» была, несумненна, «Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку. Багаславі, Ойча!», дзе ідэалізаваны і ўзвышаны вобраз нашай землячкі раскрыты згодна з эстэтыкай і канонамі агіяграфічнага ці жыційнага жанру.

Нагадаем, што героямі жыцій з'яўляюцца падзвіжнікі хрысціянства, якія за розныя заслугі перад царквой і верай былі прызнаны святымі. У сувязі з гэтым варта прыгадаць такіх выхадцаў з беларускіх зямель, як Еўфрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі. Жыццё такіх асоб павінна было служыць прыкладам для ўсіх веруючых, таму іх вобразы пазбаўлены індывідуальнасці, ідэалізуюцца, мадэлююцца з вядомага набору выключна станоўчых якасцяў, аддаляюцца ад рэальнасці. Агіяграфічныя творы адрозніваюцца схематызмам, аднатыпнасцю ў будове і манеры апавядання.

Кананічнае жыціе складалася з трох частак. У большасці такіх твораў пасля рытарычнага ўступу (часцей змяшчалася формула самапрыніжэння) распавядаецца пра нараджэнне святога дзіцяці, у час якога нярэдка адбываюцца дзівосныя праявы і цуды. Аўтар мог таксама адзначыць дабрачыннасць бацькоў святога, іх набожнасць і міласэрнасць.

Звычайна герой жыція яшчэ ў дзяцінстве выяўляе любоў да кніг і хрысціянскай веры. У манастырскай келлі святы ці святая праводзіць час у малітвах і посце, чым дабіваецца прызнання і любові браціі, ігумена (ігуменні) і міран. У некаторых выпадках святы ці святая дабіваецца прызнання пасля шматлікіх выпрабаванняў, дэманавых спакусаў і нават ганенняў. Адзначыны Духам Святым, герой жыція здзяйсняе цуды, размаўляе з анёламі. У канцы такіх твораў звычайна змяшчалася шматслоўная пахвала святому ці святой. Там можа быць і параўнанне героя жыція са старажытнымі святымі, і просьба маліцца за тых, хто шануе яго памяць, і рытарычныя заклікі да яго бацькоў.

Жыціі даюць унікальны матэрыял пра ўмовы жыцця, светапогляд, асяроддзе, у якім жывуць іх персанажы, адлюстроўваюць перад чытачом панарамную карціну найперш духоўнага жыцця пэўнай эпохі. Цяжка не пагадзіцца з даследчыкам А.А. Мельнікавым, які назваў агіяграфічную літаратуру эпохі Сярэднявечча «летапісам духу» [3, с. 14].

Зразумела, выяўленне асобы асветніцы ў сваёй эпосе і часе вымагала ад пісьменнікаў значнага паглыблення ў гісторыка-культурны пласт мінуўшчыны, даследавання вядомых пісьмовых крыніц, якія б значна дапамаглі пры стварэнні мастацкага вобраза.

Пры стварэнні гістарычнага твора «Прадыслава» Вольгай Іпатавай за аснову былі ўзяты толькі біяграфічныя факты з *«Аповесці жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні …»*: звесткі пра сем'і сыноў Усяслава Полацкага, свецкае імя, адукацыя, асветніцкая і міратворчая дзейнасць і інш. Светаадчуванне, унутраны свет і псіхалогія гераіні перададзены ж з дапамогай аўтарскай фальсіфікацыі [4, с. 9].

Аповесць «Прадыслава», бясспрэчна, вылучаецца арыгінальнасцю, што выяўляецца ў арганічным спалучэнні гістарычнага факта і творчай фантазіі. Заўважым, для пісьменніцы не характэрна празмернае захапленне дакладнымі звесткамі пра мінулае, яна імкнецца прытрымлівацца толькі агульных правілаў гістарычнага жанру. «Пісьменніца прэзентуе індывідуальна-суб'ектыўную канцэпцыю ўніверсуму асоб беларускай гісторыі праз паэтызацыю панарамнай даўніны, уласнае разуменне характараў герояў, паказ дзейнасці асобы ва ўсёй глыбіні ўзаемадачыненняў з навакольным светам» [5, с. 29], – заўважае даследчыца літаратуры М.І. Кірушкіна.

Абапіраючыся на дадзеныя гістарычнай навукі, кожны пісьменнік пры стварэнні мастацкага твора вымушаны звяртацца да фальсіфікацыі. Аднак гэты вымысел патрабуе, каб несапраўдныя, дадуманыя падзеі былі матываваныя і не супярэчылі агульнавядомым фактам гістарычных крыніц. Інакш кажучы, пры стварэнні любога гістарычнага твора пісьменнік імкнецца, з аднаго боку, да аб'ектыўнасці ў выкладзе падзей, а з другога – да вобразнасці і псіхалагічнай насычанасці постацей мінулага. Спалучэнне гэтых дзвюх рыс прыводзіць да стварэння арыгінальных мастацкіх твораў.

Згодна з «Аповесцю жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні …», беларуская асветніца і ігуменне вылучалася мудрасцю, знешняй і ўнутранай прыгажосцю, набожнасцю, пераўзыходзіла ўсіх духоўных сясцёр у посце, малітвах, збірала дабрачынныя думкі ў сваім сэрцы.

Яна задумвалася аб тым, каб пакінуць пасля сябе след: «Што ж учынілі нашыя роды, якія былі да нас? Жаніліся і выходзілі замуж, княжылі, але не вечна жылі; жыццё іх праплыло, і загінула іхняя слава, быццам прах, горай за павуцінне. Затое жанчыны, што жылі раней і, узяўшы мужчынскую моц, пайшлі следам за сваім Жаніхом, і целы свае аддалі на пакуты, і паклалі галовы пад меч, а іншыя хоць і не схілілі шыі свае пад жалеза, але мечам духоўным адсеклі плоцкія асалоды, аддаўшы целы пасту, чуйнаванню і малітоўнаму кленчанню, і ляжанню зямельнаму – тых памятаюць на зямлі, іх імёны напісаны на нябёсах, дзе яны з анёламі Бога ўсхваляюць. А слава гэтая – пыл і попел, быццам дым разыходзіцца і нібы пара водная гіне!» [3, с. 44].

Вольга Іпатава пры стварэнні мастацкага вобраза полацкай князёўны не супярэчыць гэтым звесткам і засяроджвае ўвагу на яе духоўным свеце і зазначае наступнае: «Яна заўсёды была раўнадушная да лісліва-бойкіх гаворак сватоў ды тых, хто хацеў з ёй звязаць сваё жыццё. Не ў сямейным шчасці ўяўляўся лёс. Яе павінна было чакаць наперадзе нешта асаблівае, вялікае» [5, с. 32].

Але Еўфрасіння значна мяняецца пасля сустрэчы са смердам Раманам, якога яна шчыра пакахала. Гэта ўяўляецца нам малаверагодным і гістарычна недакладным, бо пісьменніца пры напісанні аповесці не ўлічыла сацыяльных акалічнасцей (апазіцыя «раб – вяльможа»), якія ў апісаную ёй эпоху Сярэднявечча былі вызначальнымі. Варта тут прыгадаць эпізод публічнага суда над халопам, які асмеліўся ўдарыць вольнага чалавека.

Пісьменніца засяроджвае ўвагу на язычніцкай веры старэйшага пакалення полацкай княжацкай сям'і – Рагнеды і Усяслава Чарадзея, неаднойчы падкрэслівае, што яе рэшткі захаваліся і ў душы Еўфрасінні. Напрыклад, князёўна прымае ўдзел у паганскіх ігрышчах на свята Купалля, перад смерцю шэпча сваё свецкае імя – Прадыслава – і адмаўляецца цалаваць крыж. Такім чынам, Вольгай Іпатавай выказваецца версія, што язычніцтва засталося ў душы гераіні як памяць продкаў, якая, несумненна, супярэчыць «Аповесці жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні …», але дэтэрмінавана часам апісаных у аповесці падзей і мае месца на існаванне. Агульнавядомы гістарычны факт: у XII ст. на Полаччыне суіснавалі язычніцтва і хрысціянства.

У рамане-жыцці «Пакліканыя» (1998–2007) сучаснай беларускай пісьменніцы Валянціны Коўтун распавядаецца аб тым, што полацкая князёўна бавіла час у язычніцкім асяроддзі (сярод вучняў Данілы), хаця і выхоўвалася ў хрысціянскіх традыцыях чарнарызіцай-нянькай Яўлампіяй і ігуменняй. Апынуўшыся каля паганскага вогнішча, Прадслава, як зазначае пісьменніца, «сцішана стаяла збоку, адзінока назіраючы за бясцямным людскім шалам і <…> колам жарсці» [6, с. 22], адчувала сябе няўтульна і безабаронна, упершыню ў сваім жыцці падумала пра д'ябальскія спакусы.

Такім чынам, у рамане-жыцці «Пакліканыя» Валянцінай Коўтун таксама выказваецца версія, што Полацкае княства ў XII ст. было напалову «паганскім». Так, не змаглі перамагчы д'ябальскіх спакусаў і прадстаўнікі простага люду, і княжацкага роду. Сярод апошніх можна назваць менскую князёўну Вольгу, запалоцкага Барыслава і яго пазашлюбнага сына Валодшу, а таксама Звеніславу, стрыечную сястру Прадславы і дачку вялікага князя Барыса.

У аповесці «Прадыслава» Вольга Іпатава акцэнтуе ўвагу на падвоенасці ўнутранага свету галоўнай гераіні, супрацьстаянні плоцкага і духоўнага: «Жанчыны… Еўфрасінню ў апошні час пачала трывожыць тая магутная жаночая сіла, якая пругка несла гнуткае цела і блытала думкі ў час самай адрочанай малітвы. Здавалася, далёка захавала ў сабе тыя хвіліны, калі кранальі яе гарачыя мужчынскія рукі, забылася ўсё, што прынёс з сабой той далёкі чэрвень. А цяпер зноў наліваюцца трапяткія грудзі і плечы пад чорнай схімніцкай расай» [5, с. 47].

Мастацкі вобраз жа Еўфрасінні-ігуменні распрацаваны ў аповесці «Прадыслава» праўдападобна. Так, перад намі паўстае жанчына з суровым і ўпэўненым тварам, якая, несумненна, мае высокі аўтарытэт сярод міран і духоўных асоб. Дзякуючы яе намаганням перапісваліся кнігі, былі пабудаваны школы пры манастырах, бо, на думку асветніцы, выратаваць саслабелае Полацкае княства можна толькі шляхам распаўсюджвання адукацыі і ведання славутай гісторыі сваёй Айчыны: «Хлопчыкі… Хай загараюцца вочы іх святой любоўю да радзімы, хай ведаюць яны, што не толькі чужыя землі родзяць разумных і слынных людзей. Пра Рагвалода гаварыла ім, пра княгіню Рагнеду, пра Усяслава Мудрага.

Калі будуць людзі полацкія граматай валодаць так, як мячамі, – ніхто іх не пераможа.

Першая ў краі бібліятэка! Кожная кніга тут – часцінка яе душы. Купляла, абменьвала на другія. Перапісвала тут, у манастыры. Вучыла гэтаму і другіх» [5, с. 37].

Духоўны свет і характар Еўфрасінні-міратворцы, яе погляды на лёс Айчыны раскрываюцца праз дыялогі і шматлікія ўнутраныя маналогі: «Колькі ўжо князёў скінулі са стала, выгналі з зямлі сваёй. Ды ўсё роўна – нічога і яны не могуць зрабіць, пакуль не перастануць грызці адзін аднаго самі князі, смуту сеяць. Вось Усяслаў здолеў іх у адзін кулак сабраць. А пасля яго смерці зноў усё па-старому пайшло. І цяпер штогод слабее Полацк, траціць свае землі. Яна сама колькі разоў спрабавала ўшчуваць братоў, ды што з таго? Выслухаюць ветліва, згодзяцца на словах, а потым зноў тое ж самае… А яна толькі потым эпіцеміі розныя накладае на сябе за тое, што ўмешвалася ў справы мірскія» [5, с. 46].

Такім чынам, на аснове дакладных фактаў, змешчаных у «Аповесці жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні …», Вольгай Іпатавай быў створаны арыгінальны, непаўторны мастацкі вобраз Еўфрасінні Полацкай, які значна адрозніваецца ад гістарычнага прататыпа. Гэта тлумачыцца, на нашу думку, імкненнем пісьменніцы найперш зацікавіць чытача, звярнуць увагу на славутую асобу Полаччыны, вядомую за межамі нашай Бацькаўшчыны; стварыць займальны твор, у цэнтры якога – супярэчлівая і «жывая» асоба, а не фанатычная хрысціянка.

У прааналізаваным намі творы характар асветніцы, гуманісткі, мецэнаткі ўдала раскрываецца праз дыялогі і ўнутраныя маналогі. Такія элементы мастацкага псіхалагізму, на наш погляд, дазваляюць «ачалавечыць» мастацкі вобраз, зрабіць яго рэалістычным. Аповесць «Прадыслава» Вольгі Іпатавай з’яўляецца яскравым сведчаннем таго, як у мастацкім творы могуць арганічна спалучацца гістарычныя рэаліі і мастацкая фальсіфікацыя.

Варта зазначыць, што ў аповесці «Прадыслава» дамінантнай з’яўляецца ідэя незалежнасці Полацкага княства, сцвярджаецца вольнасць і гонар гэтай зямлі. Вольга Іпатава не толькі змагла зацікавіць чытача выдатнай постацю з беларускай гісторыі, але і апаэтызаваць і папулярызаваць нацыянальную культуру, паказаць станаўленне патрыятычнасці, гуманістычных і дэмакратычных традыцый у нашых продкаў.

Як намі адзначалася вышэй, да выдатнага вобраза беларускай асветніцы-кніжніцы звярнулася Валянціна Коўтун у сваім нетрадыцыйным, мадыфікаваным з жанравага пункту погляду творы – рамане-жыцiі «Пакліканыя». Як і Вольга Іпатава, Валянціна Коўтун пры стварэнніі мастацкага вобраза славутай землячкі выкарыстала вядомую пісьмовую крыніцу, якая змяшчае каштоўную інфармацыю пра беларускую асветніцу XII ст. – «Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні …».

Так, у згаданым намі вышэй рамане-жыціі беларуская асветніца вылучаецца мудрасцю («глыбінёю вочы пазіралі», «у мудрым позірку» [6, с. 25]), знешняй прыгажосцю («убіралася ў леты прыгажуня дачка» [6, с. 28], «красуня» [6, с. 28], «яшчэ гожая і ў сталым веку» [6, с. 25], «высокая і статная, гожая і, здавалася, маладзейшая нават за юніц-паслушніц» [6, с. 187], «парад усіма красунямі найпершая» [6, с. 187]), упэўненасцю і пачуццём уласнай годнасці («поўны пагарды позірк» [6, с. 25], «упартая князёўна», «ганарлівіца», «горда падняла галаву» [6, с. 21]).

Як вынікае з тэксту твора, смаленскі княжыч Дабраслаў, які сватаўся да полацкай князёўны Прадыславы, быў забіты па загадзе запалоцкага Барыслава – пазашлюбнага сына Усяслава Чарадзея. Менавіта гэтыя падзеі сталі штуршком для пастрыгу Прадславы і яе служэння Хрысту. Як і Вольга Іпатава, Валянціна Коўтун выказвае версію, што пострыг полацкай князёўны нанёс моцны ўдар па князю Святаславу-Георгію (ён праз магчымы шлюб сваёй дачкі меў намер заняць княжацкі пасад), а таксама разглядаўся сваякамі Прадславы як палітычны пралік, які выклікае знешнепалітычную небяспеку.

У рамане-жыціі «Пакліканыя» Еўфрасіння-ігумення падаецца прыхільніцай і непахіснай абаронцай хрысціянскай веры, яна вучыць жыць згодна з Боскімі запаведзямі, што адпавядае канонам агіяграфічнага жанру, рысы якога і ўтрымлівае названы твор. Варта тут хаця б прыгадаць размову ігуменні з грэчаскім манахам, падчас якой Еўфрасіння крытычна заўважае, што полацкія «князі, суроднікі, гразнуць у сквапнасці і багне ўладалюбства» [6, с. 137].

Развагі над пытаннем улады не пакідаюць Еўфрасінню Полацкую і падчас паломніцтва ў Іерусалім, на схіле свайго жыцця: «Перагортваючы цяпер згадкі пра крывавыя бітвы за княжыя стальцы, у каторы раз спрабавала яна зразумець тую вялікую таямніцу, што тоіць у сабе д’ябальская спакуса ўлады і ўсялякая магчымасць быць мацней за іншага чалавека. І мацней настолькі, што можна нават забраць у супрацiўніка дар Боскі – жыццё» [6, с. 127].

Услед за стваральнікам «Аповесці жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні …» Валянціна Коўтун адзначае ў Еўфрасінні дар лячыць людзей і прарочыць, якімі яна была надзелена Усявышнім адразу пасля свайго пострыгу: «У адно імгненне ўведала: Антонія пакутуе ад страшнай рэзі ў жываце, у сястры Еўдакіі ные пад правай рабінай, у Піліпы ажно ўгіналіся ад вузлаватых саляных наростаў худзенькія плечы» [6, с. 40]. Яна лячыла людзей ад «сілы апраметнай» малітвамі: «З блаславення Апякункі, уся знерухомеўшы, пачала рассякаць плоць юніцы, пранікаючы ўсярэдзіну, але не так, як гэбоць меч ці нож, а так, як здольна рабіць моца малітвы: праходзіла праз здаровыя тканкі да смяротнай д’ябальскай чарнаты» [6, с. 147].

Як вынікае з тэксту рамана-жыцця, да ігуменні часта звярталіся па дапамогу і ў вырашэнні пытанняў свецкага характару. Напрыклад, полацкае веча звяртаецца да яе з просьбай пераканаць княжыча Васільку прыняць кіраванне дзяржавай, і яна не адмаўляе ў дапамозе.

Такім чынам, у рамане-жыціі «Пакліканыя» наша зямлячка падаецца не толькі як сапраўдная служка Хрыста, веру ў якога яна захавала да самай смерці, але і як разважлівая, мудрая дыпламатка, якую не маглі не хваляваць падзеі грамадскага і палітычнага жыцця Полацкага княства, а таксама духоўнае і культурнае развіццё суайчыннікаў.

**Заключэнне.** У абодвух прааналізаваных намі творах пры стварэнні, бясспрэчна, эмансіпаванага вобраза Еўфрасінні Полацкай выкарыстоўваюцца наступныя мастацкія прынцыпы яе індывідуалізацыі: партрэтная і моўная характарыстыкі, апісанне адзення, дыялогі і ўнутраныя маналогі як сродак псіхалагічнага раскрыцця і інш. У пэўнай ступені ён перагукаецца з вобразам асветніцы, пададзеным у «Аповесці жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні …», але кожная пісьменніца па-свойму інтэрпрэтуе яго, падае больш ці менш праўдападобным у параўнанні з гістарычным прататыпам.

Так, большай гістарычнай дакладнасці пры адлюстраванні мастацкага вобраза Еўфрасінні Полацкай прытрымліваецца Валянціна Коўтун у «Пакліканых», што, на нашу думку, у пэўнай ступені абумоўлена нетрадыцыйнай жанравай разнавіднасцю твора – раман-жыціе – з уласцівымі яму кананічнымі агіяграфічнымі рысамі, раней адзначанымі намі.

Прааналізаваная намі літаратурныя творы выконваюць пазнавальную (папулярызуюць веды пра айчынную гісторыю), аксіялагічную (спрыяюць фарміраванню пэўнай іерархіі каштоўнасцей, нормаў маралі і жыццёвых арыенціраў), ідэалагічную (сцвярджаюць самабытнасці беларусаў; спрыяюць фарміраванню і ўмацаванню станоўчага ці адмоўнага стаўлення да пэўных асоб, працэсаў ці з'яў) і эстэтычную функцыі. Яны здольны абудзіць у чытача гонар за нацыянальнае мінулае беларусаў і велічныя ўчынкі нашай славутай суайчынніцы, дзякуючы чаму яны не страцяць сваёй актуальнасці. Думаецца, што да мастацкай інтэрпрэтацыі вобразаў нашых славутых землякоў і папулярызацыі айчыннай гісторыі яшчэ не раз звернуцца пісьменнікі.

ЛІТАРАТУРА

1. Шынкарэнка, В.К. Станаўленне і развіццё беларускай прозы пра мінулае / В.К. Шынкарэнка // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2003. – № 1. – С. 92–96.
2. Запрудскі, І.М. Партрэт асветніцы, народжаны на мяжы стагоддзяў / І.М. Запрудскі // Літаратура і мастацтва. – 2008. – 11 студзеня. – С. 6.
3. Кніга жыццяў і хаджэнняў / уклад., прадм. і камент. А.А. Мельнікава. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – 503 с.
4. Дамарад, І.І. «Князёўнаю Полацкаю пачаты …»: аповесць «Прадыслава» Вольгі Іпатавай / І.І. Дамарад // Роднае слова. – 2004. – № 8. – С. 8–11.
5. Іпатава, В.М. Прадыслава: аповесць: для сярэд. і ст. шк. узросту / В.М. Іпатава ; аўт. прадм. Л.С. Савік. – Мінск : ТДА "Сталія", 2003. − 80 с.
6. Коўтун, В.М. Пакліканыя: раман-жыціе / В.М. Коўтун. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. – 245 с.

*Паступіў 04.06.2018*

## THE ARTISTIC INTERPRETATION OF ST. EUPHROSYNE OF POLOTSK IN THE BELARUSIAN PROSE OF THE XX-XXI CENTURIES

***N. NALIOTAVA***

*The study of artistic interpretation of historical events and personalities associated with the Belarusian reality does not lose its relevance at present and attracts the attention of modern literary critics. When playing back the events of the past authors certainly rely on historical science. However, fiction also plays an important role in such cases. Modern Belarusian writers conceptual-historically interpret the personality of St. Euphrosyne of Polotsk but tend to keep to the prototype presented in «Life of St. Euphrosyne of Polotsk». This article is devoted to the study of the artistic image Euphrosyne of Polotsk in Belarusian historical prose of XX-XXI centuries. It is alleged that the writer Olga Ipatova and Valentina Kovtun, in their own way interpret the image, provide a more or less plausible when compared with the historical prototype.*

***Keywords:*** *Belarusian prose, artistic interpretation, culture, cultural figure, St. Euphrosyne of Polotsk.*